PolotskSU






**Малюнак 6. – Распаўсюджанне керамічнага посуду**

УДК 351.853.1 (476)

# ПРЫСТАСАВАННЕ МАТЭРЫЯЛЬНЫХ НЕРУХОМЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ ПАД САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ ПАТРЭБЫ (1991–2006 ГГ.) НА ПРЫКЛАДЗЕ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Андрэйчык К.В.**
Рэспубліка Беларусь, Наваполацк

*Артыкул прысвечаны дзейнасці мясцовых выканаўча-распарадчых органаў улады па прыстасаванні і выкарыстанні матэрыяльных нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей пад сацыякультурныя патрэбы на прыкладзе тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак Віцебскай вобласці. Разгледжана прававое поле, у межах якога адбывалася прыстасаванне і выкарыстанне нерухомых каштоўнасцей. Акцэнт зроблены на музеефікацыі культурнай прасторы населеных пунктаў, а таксама практычных захадах па фарміраванні прывабнага турыстычнага іміджу Полацка і Віцебска.*
***Ключавыя словы:*** *дзяржаўная палітыка, выканаўча-распарадчыя органы ўлады, гісторыка-культурныя каштоўнасці, прыстасаванне, Полацк, Віцебская вобласць*

PolotskSU



**Уводзіны**. з набыццём дзяржаўнага суверэнітэту ахова нерухомай спадчыны прадугледжвала рэгенерацыю гістарычных цэнтраў старажытных гарадоў Беларусі, асобая ўвага была звернута на Віцебск і Полацк. Ахова нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны, як комплекс прававых, адміністрацыйных і эканамічных мер, уключала мерапрыемствы па аднаўленні, рэстаўрацыі, утрыманні, прыстасаванні і выкарыстанні нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей. Акрамя аднаўлення гістарычнай забудовы, была актывізавана дзейнасць па музеефікацыі культурнай прасторы населеных пунктаў, па фарміраванні турыстычнага іміджу.

**Асноўная частка.** Прыстасаванне матэрыяльных нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей пад культурныя, адукацыйныя, турыстычныя патрэбы грамадства з'яўлялася адным з аспектаў у ахоўнай палітыцы краіны, які рэгуляваўся Законам "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (1992 г.). Адпаведна нарматыву пад прыстасаваннем разумеўся "… комплекс мерапрыемстваў па адаптацыі аб'ектаў да сучасных патрэб і асаблівасцей сучаснай тэхнічнай эксплуатацыі". Законам было прадугледжана выкарыстанне нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей у якасці арэнднай пляцоўкі, аб'екта куплі-продажу. Права ўласнасці надавалася дзяржаве, юрыдычным і фізічным асобам. Механізм карыстання аб'ектамі нерухомай спадчыны ўключаў абавязковае замацаванне за ўласнікам права валодання, а за карыстальнікам – неабходнасць заключэння ахоўнага абавязацельства. Уласнікам і карыстальнікам забаранялася дапускаць змены канструкцыйных, тэхнічных характарыстык каштоўнасці з правядзеннем усіх відаў работ без пісьмовага дазволу Дзяржаўнай інспекцыі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны (далей ДзІнаС), мяняць месца знаходжання і ўмовы ўтрымання і выкарыстання, а таксама перадаваць каштоўнасць ва ўласнасць ці карыстанне падраздзяленням Узброеных Сіл, унутраных войск, замежным юрыдычным ці фізічным асобам. Аднак у абласным цэнтры неаднаразова фіксаваліся факты парушэння заканадаўства, звязаныя, у першаю чаргу, са змяненнем знешняга выгляду помнікаў, іх тэхналагічных канструкцый.

Працэдура прыстасавання аб'ектаў нерухомай спадчыны рэгулявалася Законам "Аб уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь" (1990 г.), Пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь"Аб першачарговых мерах па захаванні і адраджэнні гістарычных цэнтраў гарадоў Беларусі" (2001 г.), "О системе мер, обеспечивающих проведение реставрационно-восстановительных работ на наиболее важных объектах историко-культурного наследия Республики Беларусь" (2002 г.), а таксама рэгіянальнымі праграмамі. Для планавання і рэалізацыі мерапрыемстваў з ліку прадстаўнікоў мясцовых выканаўча-распарадчых органаў улады, супрацоўнікаў адукацыйных, асветніцкіх, будаўнічых, рэстаўрацыйных устаноў фарміравалася працоўная група, якая выносіла прапановы па выкарыстанні камунальнай маёмасці, у тым ліку і гістарычных будынкаў. На лакальным ўзроўні мясцовымі органамі ўлады фарміраваўся план мерапрыемстваў, каштарыс, вызначаліся адказныя прадпрыемствы, установы, арганізацыі [1; 2]. Фінансаванне ажыццяўлялася за кошт рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў.

У перыяд з 1991 па 2006 гг. мясцовымі органамі ўлады былі распачаты і здзейснены мерапрыемствы па прыстасаванні помнікаў грамадзянскай архітэктуры пад установы аховы здароўя, музеі, выставачныя залы, аб'екты турыстычнай інфраструктуры. Так, у 1991 г. аддзелам культуры Віцебскага гарадскога савета народных дэпутатаў была распрацавана і зацверджана "Праграма асноўных накірункаў дзейнасці ўстаноў культуры горада па адраджэнні нацыянальнай культуры і ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы на 1991–2000 гг.", адпаведна дакументу шэраг помнікаў архітэктуры планавалася выкарыстаць пад культурна-асветніцкія мэты, праводзіўся творчы конкурс на лепшы праект забудовы і прыстасавання асобных будынкаў нерухомага фонду Задзвіння [4]. Іншым нарматывам, які рэгламентаваў аднаўленне і выкарыстанне нерухомых каштоўнасцей, было рашэнне Віцебскага гарадскога Савета народных дэпутатаў "Аб стане і мерах па далейшаму ўтрыманню помнікаў у гістарычнай частцы горада" ад 21.05.1992.

З 1994 г. у межах дзяржаўнай культурнай палітыкі ўвага органаў улады была арыентавана на адраджэнне традыцыйных рамёстваў і промыслаў праз стварэнне пляцоўкі для дзейнасці майстроў народнай творчасці і самадзейных мастакоў. Гістарычныя будынкі атрымлівалі другое жыццё пасля прыстасавання іх пад музейныя экспазіцыі, выставачныя залы, мастацкія гасцёўні, Дамы рамёстваў і інш.

У межах пашырэння сеткі музейных устаноў акцэнт быў зроблены на мастацкім мінулым горада і яго выдатных дзеячах. Адпаведна гэтаму накірунку была пастаўлена задача па аднаўленні бацькоўскага дома М. Шагала і сядзібы І. Рэпіна. Аднаўленне спадчыны М. Шагала актыўна праводзілася з дапамогай Фонда "Кола садзейнічання "Дому-музею Шагала ў Віцебску" (г. Нінбург, ФРГ). На выдзеленыя сродкі быў праведзены комплекс рамонтна-рэстаўрацыйных, навукова-даследчых работ (гісторыка-архіўныя, архітэктурна-археалагічныя даследаванні), сфарміравана экспазіцыя. У 1997 г. была скончана рэстаўрацыя і музей адчыніўся для наведвальнікаў. На працягу 1990-х гг. працягвалася рэстаўрацыя за кошт рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў прыбудовы да ратушы (1994 г.), праводзіліся работы ў літаратурным музеі і музычнай гасцёўні (Фрунзе, 11; 13), музычнай школе (Крылова, 5), школе мастацтваў (Суворава, 3). На працягу 2000-х гг. ішла праца па аднаўленні і прыстасаванні пад турыстычныя і культурна-асветніцкія мэты помнікаў прамысловай архітэктуры – былых саляных лабазаў. У XVIII ст. аб'екты выконвалі функцыю сховішча для збожжа, солі, мукі. У адноўленых будынках размясціўся культурна-гістарычны комплекс "Залатое кальцо горада Віцебска "Дзвіна", дзейнасць якога была арыентавана на захаванне, развіццё і папулярызацыю ведаў аб народных традыцыях [3]. Дасягненні па ахове гісторыка-культурнай спадчыны асвячаліся ў мясцовым друку, на старонках газеты "Віцьбічы" у раздзеле "Стары Віцебск". Акрамя выяўленчага мастацтва бачылася перспектыўным развіццё дэкаратыўна-прыкладнога накірунку. Таму, у будынках забудовы XIX–XX ст. па вул. Суворава, у 1999 г. планавалася адчыніць музей-майстэрню разьбяра Ф. Максімава. Адкрытымі для абмеркавання заставаліся пытанні размяшчэння музея ганчарства і кафлі па вул. Даватара, музея майстра па вырабе музычных інструментаў У. Казака, да 2000 г. планавалася адчыніць музей тэатральнага мастацтва (вул. Купалы), музей старажытнай зброі (вул. Фрунзе, 13), музей заснавальнікаў віцебскай мастацкай школы. Аднак з-за недахопу сродкаў не ўсе запланаваныя мерапрыемствы былі здзейсненыя.

Гарадскімі ўладамі рабіліся спробы ўзмацнення кантролю за якасцю ўзгаднення дакументацыі на будынкі гістарычнай забудовы, якія здаваліся ў арэнду (абавязковае правядзенне адпаведных гістарычных і археалагічных даследаванняў, узгадненне з ДзІнаС). Пераважная большасць помнікаў архітэктуры г. Віцебска выкарыстоўвалася для здачы ў арэнду, таму кантралюючымі органамі часта фіксаваліся выпадкі самавольных прыбудоў, змянення знешняга выгляду фасадаў, знішчэння элементаў архітэктурнага дэкору помнікаў, узвядзення новых аб'ектаў у ахоўнай зоне, размяшчэння гандлёвых кропак у пад'ездах і скразных праёмах гістарычных будынкаў (гаражы і кафэ ў парку імя Фрунзе, прыбудовы да дамоў па вул. Грыбаедава, 21; 23; 25), крамы ў дамах па вул. Леніна 14, Талстога, 3. Акрамя таго, часта фіксаваліся выпадкі

PolotskSU



правядзення капітальнага рамонту, будаўнічых работ без навуковага абгрунтавання рэстаўрацыі і адпаведнага дазволу ў будынках, займаемых пад жыллё. Такім чынам, прынятае гарвыканкамам рашэнне ад 21 мая 1992 г. “Аб стане і мерах па далейшаму ўтрыманню помнікаў у гістарычнай частцы горада” не выконвалася.

Маштабныя мерапрыемствы ў Полацку былі здзейснены ў рамках Комплекснай доўгатэрміновай праграмы развіцця г. Полацка і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка [5]. У 2000 г. старшынёй Полацкага гарвыканкама У.С. Тачылам былі вызначаны пытанні развіцця гарадской інфраструктуры, сацыяльнага сектара на рэспубліканскім узроўні. Асобая ўвага была скіравана на неабходнасць фарміравання прывабнага турыстычнага іміджу. Паступова, на працягу 1990-х г. былі адкрыты 4 новыя музеі ў структуры Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. У 1993 г. быў адкрыты музей-бібліятэка С. Полацкага, у 1998 г. – музей традыцыйнага ручнога ткацтва беларускага Паазер’я, у тым жа годзе музей “Прагулка па Ніжне-Пакроўскай”. У 2002 г. у адным з карпусоў архітэктурнага ансамбля былога езуіцкага калегіума была адчынена мастацкая галерэя. Другое жыццё атрымалі будынкі езуіцкага калегіума пасля передачы іх з баланса Міністэрства абароны да Міністэрства адукацыі. У 2005 г. пасля некалькіх год рэстаўрацыйна-рамонтных работ асветніцкія традыцыі ў старажытных мурах працягнуў Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт [6]. Сярод нязздзейсненых планаў засталіся: адкрыццё музея старажытнага жывапісу і архітэктуры (1996 г.), музея доблесці воінскай зброі (2000 г.).

Акрамя абласнога цэнтру прыстасаванне помнікаў архітэктуры пад культурна-асветніцкія мэты адбывалася ў шэрагу раённых цэнтраў. Так, рашэннем Глыбоцкага выканкама раённага Савета народных дэпутатаў № 204 ад 31 жніўня 1992 г. пад патрэбы гісторыка-этнаграфічнага музея быў перададзены помнік архітэктуры п.п. ХХ ст. (былы жылы будынак, пазней займаемы гарсаветам). У 1997 г. музей сустрэў першых наведвальнікаў. У 2005 г. рашэннем Глыбоцкага раённага выканаўчага камітэта быў створаны філіял музея ў в. Мосар. У 1996 г. пачалася праца па передачы і прыстасаванні помніка архітэктуры пач. ХХ ст. пад патрэбы Талачынскага музея. У 1998 г. з нагоды падрыхтоўкі да 1000-годдзя Друцка ў будынку была праведзена рэканструкцыя, створана музейная экспазіцыя. Ужо ў 2000 г. аб’ект атрымаў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Першых наведвальнікаў музей сустрэў 31 жніўня 2001 г. з 1990 г. пад патрэбы ўстановы дадатковай адукацыі дзяцей і падлеткаў была выкарыстана сядзіба ўласнікаў Гласко “Станіслававa” (помнік архітэктуры канца ХІХ – пач. ХХ стст.) у Расонах (Верхнядзвінскі раён). У былым жылым будынку к. ХІХ ст., які належаў купцу, у 1991 г. быў адкрыты Чашніцкі гістарычны музей. У 1991 г.ў Оршы ў адпаведнасці з гарадской праграмай “Адраджэнне” пачалася рэканструкцыя помніка прамысловай архітэктуры – будынка былога вадзяного млына (1902 г.). Рэстаўрацыя помніка архітэктуры была паспяхова завершана да канца 1994 г., а ўжо у 1995 г. у ім адкрыўся Аршанскі этнаграфічны музей “Млын”. Пастановай Саўміна РБ ад 14.05. 2007 г. № 578 будынку музея быў прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці каштоўнасці 2 катэгорыі. Другім прыкладам стала прыстасаванне вадзяного млына ў г. Паставы (2-й пал. ХІХ ст.–пач. ХХ ст.). Рэстаўрацыя была скончаны ў 1994 г. У будынку размясціўся Дом рамёстваў “Стары млын”.

Даволі распаўсюджанай практыкай з’яўлялася прыстасаванне і выкарыстанне архітэктурных комплексаў былых сядзіб пад установы аховы здароўя. Напрыклад, з пачатку 1990-х г. сядзібны дом з паркам і гаспадарчымі пабудовамі ў в. Бяздзедавічы (Полацкі раён) выкарыстоўваўся як участковая бальніца. Утрыманне матэрыяльных нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей на балансе карыстальнікаў патрабавала ад апошніх выканання ў межах заканадаўства ахоўнага абавязацельства, якое рэгламентавала ўмовы недапушчэння тэхнічных змяненняў, пашкоджанняў і інш. Аднак, у 1996 г. інспектарам ДзІнАС па Віцебскай вобласці – Н. А. Сулецкай была адзначана перапланіроўка калідорна-анфіладнай сістэмы пакояў з прыстасаваннем флігеля пад жылы дом, у доме скотніка без узгаднення былі аднаўлены страчаныя часткі сцен і аконныя праёмы. Сядзібны дом, прыстасаваны пад лячэбны корпус, таксама атрымаў некаторыя змяненні. Усе работы былі праведзены на помніку архітэктуры без праектнай дакументацыі, пабудовы гаспадарчага назначэння (сарай, хлеў) часткова былі аднаўлены па старых фрагментах і выкарыстоўваліся пад гаражы. Парк знаходзіўся ў дрэнным стане. У выніку абследавання помніка і яго тэрыторыі, Полацкаму райвыканкаму было даручана дакументальна пацвердзіць права валодання на кожную пабудову, а таксама мецць на кантролі ўтрыманне на тэрыторыі парка транспартных сродкаў, тэхнікі, паруча-змазачных матэрыялаў з мэтай недапушчэння забруджвання тэрыторыі [7].

З пачатку 1990-х г. на нарадах Віцебскага абласнога савета народных дэпутатаў абмяркоўваліся пытанні магчымага выкарыстання былых станцыйных дамоў Віцебскай вобласці. У 1993 г. разглядаліся прапановы адносна 4 аб’ектаў: станцыя у в. Кузьміна (Гарадоцкі раён), у в. Бараўляны (Мазолаўскага с\с, Віцебскі раён), у в. Паграбёнка (Багушэўскі с\с, Сенненскі раён), в. Заольша (Лёзненскі раён). Былыя паштовыя станцыі былі пабудаваны адпаведна тыпавых праектаў 1846 г. Усе аб’екты знаходзіліся на балансе дарожных упраўленняў, напрыклад ДРСУ-52, РА “Аўтамагістраль”, “Віцебскаблдарбуд”. Лёс будынкаў у в. Паграбёнка застаўся нявызначаным. Былую станцыю ў в. Заольша планавалася прыстасаваць пад пункт мытнага кантролю, а ў в. Кузьміна як аб’ект прыдарожнага сервісу. Аднак, у выніку міжведамаснага абмеркавання прыйсці да канчатковага рашэння не ўдалося, бо аб’екты знаходзіліся ў благім тэхнічным стане і патрабавалі значных капіталаўкладанняў. У 1992 г. Віцебскі аддзел беларускай чыгункі выступіў заказчыкам праекта рэстаўрацыі вакзала ў в. Бігосава (Верхнядзвінскі раён). Будынку (1924 – 1926 гг.) была прысвоена ІІ катэгорыя каштоўнасці [8].

**Высновы.** Такім чынам, у межах рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі па ахове і захаванні нерухомай спадчыны на працягу 1991 – 2006 г. праводзіліся мерапрыемствы па прыстасаванні і выкарыстанні аб’ектаў пад сацыяльна значныя функцыі. Аднаўленне нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей садзейнічала ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы сацыякультурнага комплексу, добраўпарадкаванню і эстэтызацыі тэрыторый грамадскага карыстання, музеефікацыі культурнай прасторы населеных пунктаў, папулярызацыі ведаў аб яго багатай матэрыяльнай і духоўнай спадчыне, развіццю турызму. Адпаведна рэалізацыі мэтавых праграм быў пакладзены пачатак фарміраванню турыстычнага іміджу Полацка – як вытоку беларускай дзяржаўнасці і духоўнасці, а Віцебска – як мастацкай сталіцы краіны. Пад сацыякультурныя патрэбы былі прыстасаваны памятныя мясціны і аб’екты, звязаныя з жыццём і дзейнасцю прадстаўнікоў мастацтва (дом М. Шагала ў Віцебску, сядзіба І. Рэпіна,), былая навучальная ўстанова (Полацкі езуіцкі калегіум), былыя жылыя дамы (Полацк, Віцебск,), помнікі прамысловай архітэктуры: млыны, саляныя лабазы (Орша, Паставы, Віцебск), чыгуначны вакзал (ст. Бігосава, Верхнядзвінскага раёна). Аднак помнікі архітэктуры, якія былі заняты на правах арэнды, часам выкарыстоўваліся з парушэннем тэхнічнага стану, змяненнем знешняга аблічча (забудова ХІХ ст. у г. Віцебск). Другое жыццё матэрыяльныя нерухомыя гісторыка-культурныя каштоўнасці атрымалі пасля прыстасавання пад культурныя, адукацыйныя, медыцынскія ўстановы.

PolotskSU




**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Ганський, В.О. Історико-культурна спадщина як фактор локального соціально-економічного розвитку / В.О. Ганський // Приазовський економічний вісник. – 2018. – № 2. – С. 99-105.
2. Андрэйчык, К.В. Ахова і выкарыстанне матэрыяльных нерухомых помнікаў гісторыі і культуры ў Рэспубліцы Беларусь у 1991–2001 гг. : планаванне і мерапрыемствы мясцовых улад / К.В. Андрэйчык // Романовские чтения –13 : сб. статей междунар. научн. конф., посвященной 105–летию МГУ имени А. А. Кулешова, Могилев, 25–26 окт. 2018 г. / под общ. ред. А. С. Мельниковой. – Могилёв : МГУ им. А.А. Кулешова, 2019. – С. 110–111.
3. Андрэйчык, К.В. Захаванне і адраджэнне гісторыка-культурнай спадчыны горада Віцебска ў 1991–2001 г. / К.В. Андрэйчык // Научн. труды Респ. ин-та высш. школы. – 2018. – Ч. 1. – С. 3–9.
4. Андрэйчык, К.В. Добраўпарадкаванне нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей г. Віцебска і Віцебскай вобласці ў 1991–2001 гг. : планаванне і мерапрыемствы мясцовых улад / К.В. Андрэйчык // Віцебскі край : матэрыялы IV міжнарод. навук.-практычн. канф., прысвечанай 80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці, Віцебск, 22 ліст. 2018 г. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2019. – Т. 4. – С. 26–31.
5. Андрэйчык, К.В. Рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі захавання гісторыка-культурнай спадчыны Полацка на прыкладзе Комплекснай доўгатэрміновай праграмы развіцця г. Полацка і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (2000–2005 гг.) / К.В. Андрэйчык // Весн. Полацк. дзярж. ун-та. Сер. А, Гуманіт. навукі. – 2020. – № 1. – С. 2–6.
6. Андрэйчык, К.В. Захаванне асветніцкіх традыцый Полацка як элемент культурна-адукацыйнай прасторы Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта / К.В. Андрэйчык // Вышэйшая школа. – 2017. – № 5. – С. 26–30.
7. Андрэйчык, К.В. Ахова і выкарыстанне нерухомых гісторыка–культурных каштоўнасцей г. Полацка з 1991 г. па 2001 г. / К.В. Андрэйчык // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : электронны зборнік навуковых артыкулаў IV міжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацк, 19 – 20 крас. 2018 г. / пад агульн. рэд. А.І. Корсак. – Наваполацк : ПДУ, 2018. – С. 771–780.
8. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 1275. – Воп. 1. – Спр.10. – Арк. 41.


## ADAPTATION OF MATERIAL IMMOVABLE HISTORICAL AND CULTURAL VALUES TO SOCIO-CULTURAL NEEDS (1991–2006) ON THE EXAMPLE OF THE VITEBSK REGION

K. ANDREICHYK

*The article is devoted to the activities of local executive and administrative authorities on the arrangement and use of material immovable historical and cultural values for socio-cultural needs on the example of territorial and administrative units of the Vitebsk region. The legal field within which the adaptation and use of fixed values took place is considered. The focus is on the museumification of the cultural space of localities, as well as practical measures to create an attractive tourist image of Polotsk and Vitebsk.*

***Key words:*** *state policy, executive and administrative authorities, historical and cultural values, adaptation, Polotsk, Vitebsk region*

УДК 392:273.2(476.5)

## СТАРАВЕРЫ ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ: АСАБЛІВАСЦІ РАССЯЛЕННЯ І ДЭМАГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

**Аўсейчык У.Я.**
Рэспубліка Беларусь, Наваполацк

*У артыкуле прааналізаваны асаблівасці рассялення і разгледжаны дэмаграфічныя працэсы ў стараверскага насельніцтва Паўночнай Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. На аснове аналізу статыстычных матэрыялаў вылучаны асноўныя месцы пражывання старавераў на тэрыторыі рэгіёна, прасочана дынаміка іх колькасці па асобных адміністрацыйных адзінках, прааналізаваны суадносіны гарадскога і сельскага насельніцтва, вылучаны гарадскія цэнтры старавераў на тэрыторыі рэгіёна.*

***Ключавыя словы:*** *старaверы, Паўночная Беларусь, рассяленне, арэал, колькасць насельніцтва, стараверская абшчына, дэмаграфія, этналогія.*

**Уводзіны.** З сярэдзіны XVII ст. на тэрыторыі Паўночнай Беларусі побач з мясцовым насельніцтвам пражывае значная колькасць рускіх старавераў, якія эмігравалі сюды ў выніку рэформаў патрыярха Нікана. Рэгіён з'яўляецца адным з асноўных цэнтраў стараверства ў Беларусі. Такая сітуацыя характэрна як у мінулым, так і ў сучасны перыяд. Менавіта ў паўночнай частцы Беларусі знаходзіцца большасць стараверскіх абшчын у наш час. За больш чым трохсотгадовы перыяд пражывання на беларускіх землях перасяленцы-старaверы не толькі развілі сваю культуру, але і папоўнілі скарбонку культурнай спадчыны беларускай зямлі, аказалі ўплыў на развіццё мясцовага насельніцтва.

Артыкул прысвечаны разгляду асаблівасцей рассялення і дэмаграфічных працэсаў у стараверaў Паўночнай Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Менавіта гэты перыяд адзначаны наяўнасцю дастатковай колькасці статыстычных даных, якія дазваляюць дасягнуць пастаўленай мэты. Па больш жа ранніх перыядах такая інфармацыя фрагментарная і няпоўная.

У беларускім народазнаўстве пытанні, звязаныя са спецыфікай рассялення стараверaў у паўночнай частцы Беларусі, іх колькасці, арэалах пражывання, дэмаграфічных працэсах у XIX – першай палове XX ст. застаюцца да канца ня вырашанымі. Шэраг навукоўцаў прадпрымалі спробы даследавання асобных аспектаў гэтых праблем. У першую чаргу, гэта датычыцца асаблівасцей рассялення стараверaў на паўночнабеларускіх землях. Беларускі гісторык А.А. Гарбацкі вылучыў асноўныя арэалы першапачатковага пасялення ў другой палове XVII – XVIII ст., прывёў статыстычныя даныя па асобных адміністрацыйных адзінках у XIX – пачатку XX ст. [1]. На аснове палявых даследаванняў канца XX ст. даследчыца Н.Я. Мініна вызначыла агульныя рысы арэалаў пасялення стараверaў у межах Віцебскай вобласці [2, с. 6]. Літоўскія даследчыкі Г.У. Паташанка і Н.А. Марозава разглядалі пытанні рассялення стараверaў на беларуска-літоўска-латвійскім памежжы. Гісторык Г.У. Паташанка ахарактарызаваў геаграфію іх рассялення, прадпрыняў спробу прасачыць дэмаграфічныя змены на

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ: ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Наваполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў”. Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2**

© Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 1/8. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.